# КНІГА ПРАРОКА МІХЕЯ

1 Слова Гасподняе, якое было Міхею Марастыціну ў
дні Ёатама, Ахаза і Эзэкіі, цароў Юдэйскіх, і якое
адкрыта яму ў Самарыі і Ерусаліме.
2 Слухайце ўсе народы, уважай, зямля і ўсё, што
напаўняе яе! Хай будзе Гасподзь Бог сьведка супроць
вас, Госпадзе зь сьвятога храма Свайго!
3 Бо вось, Гасподзь выходзіць зь месца Свайго, сыдзе і
наступіць на вышыні зямлі,
4 і горы растануць пад Ім, даліны распадуцца, як воск
ад агню, як воды, што льюцца з урвішча.
5 Усё гэта - за грэшнасьць Якава, за грэх дому
Ізраілевага. Ад каго грэшнасьць Якава? ці не ад
Самарыі? Хто зладзіў вышыні ў Юдэі? ці не Ерусалім?
6 За што зраблю Самарыю грудай руінаў у полі,
месцам пад разьвядзеньне вінаграду; скіну ў даліну
каменьне яе і агалю асновы яе.
7 Усе балваны яе будуць разьбіты і ўсе любадзейныя
дары яе спалены будуць агнём, і ўсіх ідалаў яе аддам
на разбурэньне, бо зь любадзейных дароў яна рабіла
іх; на любадзейныя дары яны і будуць абернуты.
8 За гэта я буду плакаць і галасіць, буду хадзіць як
абрабаваны і аголены, выць, як шакалы, і плакаць, як
страўсы,
9 бо балючае паражэньне яе, дайшло да Юды,
дасягнула нават да брамы народу майго, да
Ерусаліма.
10 Не абвяшчайце пра гэта ў Гэце, ня плачце там
уголас; а ў селішчы Офра пакрый сябе попелам.
11 Перасяляйцеся, жыхаркі Шафіра, сорамна
агаленыя; не ўцячэ і тая, што жыве ў Цаане; плач
у селішчы Эцаль ня дасьць вам спыніцца ў ім.

12 Бядуе па сваім дабры жыхарка Мароты, бо сышло
бедства ад Госпада да брамы Ерусаліма.
13 Запрагай у калясьніцу борздых, жыхарка Лахіса; ты
- пачатак грэху дачкі Сіёнавай, бо ў цябе паявіліся
злачынствы Ізраіля.
14 Таму ты пасылаць будзеш дары ў Марэшэт-Гэт; але
селішчы Ахзіва будуць падманам царам Ізраілевым.
15 Яшчэ нашчадка прывядуць да цябе, жыхарка
Марэша; ён пройдзе да Адалама, славы Ізраіля.
16 Здымі зь сябе валасы, астрыжыся, смуткуючы па
пяшчотналюбасных сынах тваіх; пашыры дзеля іх
лысіну, як у лінялага арла, бо яны перасελены будуць
ад цябе.

# Міх 2

1 Гора тым, якія намышляюць беззаконьне і на ложках
сваіх прыдумваюць зладзействы, якія ўчыняюць
раніцай на сьвітаньні, бо ёсьць у руцэ ў іх сіла!
2 Захочуць палёў, і бяруць іх сілаю, дамоў - і адбіраюць
іх; абіраюць чалавека і яго дом, мужа і яго спадчыну.
3 Таму так кажа Гасподзь: вось, я намышляю навесьці
на гэты род такое бедства, якога вы ня скінеце з шыі
вашай, і ня будзеце хадзіць выпрастаўшыся; бо гэта
час ліхі.
4 У той дзень скажуць пра вас прытчу, і будуць
плакаць горкімі сьлязьмі і казаць: «мы зусім
спустошаныя! доля народу майго аддадзена іншым;
як вернецца да мяне! палі нашыя ўжо разьдзелены
іншапляменцамі».
5 Таму ня будзе ў цябе нікога, хто кінуў бы жэрабя для
вымярэньня на сходзе перад Госпадам.
6 Не прарочце, прарокі; не прарочце ім, каб не
спасьцігла вас няслава.
7 О, той, хто называе сябе домам Якава! Хіба
ж паменшыўся дух Гасподні? ці такія дзеяньні

Яго? ці не дабратворныя словы мае таму, хто дзее
справядліва?
8 А народ, які быў раней Маім, паўстаў як вораг, і вы
адбіраеце як верхнюю так і споднюю вопратку ў тых,
што праходзяць мірна, хто адварочваецца ад вайны.
9 Жанчын народу Майго вы выганяеце з прыёмных
дамоў іхніх; у дзяцей іхніх вы назаўсёды адбіраеце
акрасу Маю.
10 Устаньце і адыдзеце, бо краіна гэтая ня ёсьць месца
спакою; за нячыстасьць яна будзе спустошана і пры
тым жорсткім спусташэньнем.
11 Калі б які-небудзь ветрагон выдумаў ману і сказаў:
«я буду прапаведаваць табе пра віно і сікеру», дык ён
і быў бы заўгодным прапеведнікам гэтаму народу.
12 Абавязкова зьбяру ўсяго цябе, Якаве, абавязкова
злучу рэшткі Ізраіля, спалучу іх у адно, як авечак у
Васоры, як статак у авечай кашары; зашумяць яны ад
шматлюдства.
13 Перад імі пойдзе разбуральнік муроў; яны
зьнішчаць перашкоды, увойдуць праз браму і
выйдуць празь яе, і цар іхні пойдзе перад імі, а на
чале іх - Гасподзь.

# Міх 3

1 І сказаў я: слухайце, галовы Якава і князі дома
Ізраілевага: ці ж ня вам трэба ведаць праўду?
2 А вы ненавідзіце добрае і любіце ліхое; лупіце зь іх
скуру іхнюю і плоць з касьцей іхніх,
3 ясьце плод народу Майго і лупіце зь іх скуру іхнюю, а
косьці іх ламаеце і крышыце як бы ў горшчык, і плоць
- як бы ў кацёл.
4 І будуць яны заклікаць да Госпада, але Ён не пачуе
іх і схавае аблічча Сваё ад іх на той час, як яны
злдзейнічаюць.

5 Так казаў Гасподзь на пракокаў, якія ўводзяць у
аблуду народ Мой, якія грызуць зубамі сваімі - і
прапаведуюць мір, а хто нічога не кладзе ім у рот,
супроць таго абвяшчаюць вайну.
6 Таму ноч будзе вам замест уявы і цемра - замест
прадказаньняў; зойдзе сонца над праракамі і
пацямнее дзень над імі.
7 І пасаромеюцца празорліўцы, і пасаромленыя
будуць варажбіты, і замкнуць вусны свае ўсе яны,
таму што ня будзе адказу ад Бога.
8 А я напоўнены сілаю Духа Гасподняга, праўды і
цьвёрдасьці, каб выказаць Якаву злачынства яго і
Ізраілю - грэх ягоны.
9 Слухайце ж гэта, галовы дому Якаўлевага і князі
дому Ізраілевага, якія грэбуюць правасудзьдзем і
скрыўляюць усё простае,
10 будуюць Сіён крывёю і Ерусалім - няпраўдаю!
11 Галовы яго судзяць за дарункі і сьвятары яго вучаць
за плату і пракокі яго прадказваюць за грошы, а тым
часам абапіраюцца на Госпада, кажучы: «ці не сярод
вас Гасподзь? Не спасьцігне нас бяда!»
12 Таму за вас Сіён узараны будзе як поле, і Ерусалім
зробіцца грудай руінаў, і гара дома гэтага будзе
лясістым пагоркам.

# Міх 4

1 І будзе ў апошнія дні: гара дома Гасподняга
пастаўлена будзе на чале гор і ўзвысіцца над
пагоркамі, і пацякуць да яе народы.
2 І пойдуць многія народы і скажуць: «прыйдзеце, і
ўзыдзем на гару Гасподнюю і ў дом Бога Якаўлевага,
- і Ён навучыць нас шляхам Сваім, і будзем хадзіць
па сьцежках Ягоных; бо ад Сіёна выйдзе закон і слова
Гасподняе - зь Ерусаліма.

3 І будзе Ён судзіць многія народы і выкрые многія
плямёны ў далёкіх краінах; і перакуюць яны мечы
свае на аралы і дзіды свае - на сярпы; не падыме народ
на народ меча, і ня будуць болей вучыцца ваяваць,
4 але кожны будзе сядзець пад сваёю вінаграднаю
лазою і пад сваёю смакоўніцай, і ніхто ня будзе
палохаць іх, бо вусны Госпада Саваофа вымавілі гэта.
5 Бо ўсе народы ходзяць, кожны - у імя свайго бога; а
мы будзем хадзіць у імя Госпада Бога нашага вавек».
6 У той дзень, кажа Гасподзь, зьбяру кульгавае і
спалучу разагнанае і тых, на каго я навёў бедства.
7 І зраблю кульгавае астаткам і далёка расьсеянае
моцным народам, і Гасподзь будзе валадарыць над імі
на гары Сіёне ад сёньня і давеку.
8 А ты, вежа статку, пагорак дачкі Сіёна! да цябе
прыйдзе і вернецца ранейшае ўладарства, царства - да
дачок Ерусаліма.
9 Дзеля чаго ж ты сёньня так голасна лямантуеш? Хіба
няма ў цябе цара? Альбо ня стала ў цябе дарадцы, што
цябе схапілі пакуты, як парадзіху?
10 Пакутуй і ўбольвайся мукамі, дачка Сіёна, як
парадзіха, бо сёньня ты выйдзеш з горада і будзеш
жыць у полі і дойдзеш да Вавілона. Ты будзеш
выратавана, там адкупіць цябе Гасподзь ад рукі
ворагаў тваіх.
11 А цяпер сабраліся супроць цябе многія народы і
кажуць: «хай будзе яна апаганена, і хай нагледзіцца
вока нашае на Сіён!»
12 Але яны ня ведаюць думак Госпадніх і не разумеюць
рады Ягонай, што Ён сабраў іх як снапы на гумно.
13 Устань і малаці, дачка Сіёна; бо Я зраблю рог
твой жалезным і капыты твае зраблю меднымі, -
і скрышыш многія народы і прысьвеціш Госпаду
здабыткі іхнія і багацьці іхнія Уладару ўсёй зямлі.

# Міх 5

1 Цяпер узбурся, дачка полчышчаў: абкладзі нас
аблогаю, трысьцінаю біцьмуць па шчацэ судзьдзю
Ізраілевага.
2 І ты, Віфляеме - Эфрата, ці ж малы ты сярод тысячаў
Юдавых? зь цябе пойдзе Мне Той, Які павінен быць
Валадаром у Ізраілі, і Якога паходжаньне з пачатку,
ад дзён вечных.
3 Таму Ён пакіне іх да часу, пакуль ня родзіць тая,
што мае радзіць; тады вернуцца да сыноў Ізраіля і
пазасталыя браты іхнія.
4 І стане Ён, і будзе пасьвіць у сіле Гасподняй, у велічы
імя Госпада Бога Свайго і яны будуць жыць бясьпечна,
бо тады Ён будзе вялікі да краёў зямлі.
5 І будзе Ён - мір. Калі Асур прыйдзе ў нашую зямлю
і ўступіць у нашыя харомы, мы выставім супроць яго
сем пастыраў і восем князёў.
6 І будуць яны пасьвіць зямлю Асура мечам і зямлю
Нэмврода ў самай браме яе, і вось Ён выбавіць
ад Асура, калі той прыйдзе ў зямлю нашую і калі
ўступіць у межы нашыя.
7 І будзе астатак Якава сярод многіх народаў як раса
ад Госпада, як зьліва на траву, і ён ня будзе залежаць
ад чалавека і пакладацца на сыноў Адамавых.
8 І будзе астатак Якаваў паміж народамі, сярод многіх
плямёнаў, як леў - сярод зьвяроў лясных, як ільвяня
- сярод статку авечак, які, калі выступіць, дык топча і
рве, і ніхто не ўратуе ад яго.
9 Падымецца рука твая над ворагамі тваімі, і ўсе
непрыяцелі твае будуць вынішчаны.
10 І будзе ў той дзень, кажа Гасподзь: зьнішчу коней
тваіх з асяродзьдзя твайго і зьнішчу калясьніцы твае,
11 вынішчу гарады ў зямлі тваёй, і разбуру ўсе
ўмацаваньні твае;

12 і вырву чарадзействы з рукі тваёй, і варажбітоў па
аблоках ня будзе ў цябе;
13 зьнішчу балваноў тваіх і ідалаў з асяродзьдзя
твайго, - і ня будзеш больш пакланяцца вырабам рук
тваіх;
14 выкараню з асяродзьдзя твайго сьвяшчэнныя гаі
твае і спустошу гарады твае.
15 І ўчыню ў гневе і абурэньні помсту над народамі,
якія будуць непаслухмяныя.

# Міх 6

1 Слухайце, што кажа Гасподзь; устань, судзіся перад
гарамі, і пагоркі няхай чуюць голас твой!
2 Слухайце, горы, суд Гасподні, і вы, цьвёрдыя асновы
зямлі, бо ў Госпада - суд з народам Сваім, і зь Ізраілем
Ён спаборнічае.
3 Народзе мой! што зрабіў Я табе і чым абцяжарваў
цябе? адказвай Мне.
4 Я вывеў цябе зь зямлі Егіпецкай і выкупіў цябе з дома
рабства і паслаў перад табою Майсея, Арона і Марыям.
5 Народзе Мой! успомні, што намышляў Валак, цар
Маавіцкі, і што адказваў яму Валаам, сын Вэораў і
што рабілася ад Сітыма да Галгалаў, каб спазнаць табе
праведня дзеі Гасподнія.
6 «З чым стаць мне перад Госпадам, пакланіцца
перад Богам Нябесным? Ці стаць перад Ім з
цэласпаленьнямі, зь цялятамі-аднагодкамі?
7 Але ці можна дагадзіць Госпаду тысячамі бараноў
альбо безьлічнымі патокамі алею? Ці ж бо дам Яму
першынца майго за злачынства маё і плод чэрава
майго - за грэх душы маёй?»
8 О, чалавеча! сказана табе, што - дабро, і чаго
патрабуе ад цябе Гасподзь: дзейнічаць справядліва,

любіць справы міласэрнасьці і пакорнамудра хадзіць
перад Богам тваім.
9 Голас Госпада кліча да горада, і мудрасьць нямее
перад імем Тваім: слухайце жазло і Таго, хто паставіў
яго.
10 Ці не знаходзяцца і цяпер у доме ў бязбожнага
скарбы бязбожнасьці і паменшаная мера, агідная?
11 Ці магу я быць чысты з вагамі няправільнымі і з
падманнымі гірамі ў торбе?
12 Так і гэтак багацеі яго поўныя няпраўды, і жыхары
яго кажуць хлусьню, і язык іхні ёсьць падман у вуснах
іхніх,
13 дык і Я нявылечна ўражу цябе спусташэньнем за
грахі твае.
14 Ты будзеш есьці - і ня будзеш сыты; пустата
будзе ўсярэдзіне ў цябе; будзеш ашчаджаць, але не
ашчадзіш, а што ашчадзіш, тое аддам мечу.
15 Будзеш сеяць, а жаць ня будзеш; будзеш чавіць
алівы - і ня будзеш умашчвацца алеем; начавіш
вінаграднага соку, а віна піць ня будзеш.
16 Захаваліся ў вас звычаі Аўрамія і ўсе справы дому
Ахававага, і вы робіце паводле парадаў іхніх; і аддам
Я цябе спусташэньню і жыхароў тваіх - пасьмяяньню,
і вы панесяце нагану народу Майго.

# Міх 7

1 Гора мне! бо са мною цяпер - як пасьля збору летніх
пладоў, як пасьля збору вінаграду: ніводнай ягадзіны
на ежу, ні сьпелага плоду, якога жадае душа мая.
2 Ня стала міласэрных на зямлі, няма праўдзівых
сярод людзей; усе куюць змусты, каб праліваць кроў;
кожны ставіць на брата свайго сетку.
3 Рукі іхнія павернуты на тое, каб умець рабіць ліха;
начальнік патрабуе дарункаў, і судзьдзя судзіць за

хабар, а вяльможы выказваюць благія хаценьні душы
сваёй і перакручваюць справу.
4 Лепшы зь іх - як цёрн і справядлівы - горшы
за калючы плот. Дзень узьвяшчальнікаў Тваіх,
адведзіны Твае настаюць; сёньня спасьцігне іх
бянтэжа.
5 Ня верце сябру, не пакладайцеся на прыяцеля; ад
той, што ляжыць на ўлоньні тваім, ахоўвае дзьверы
вуснаў тваіх.
6 Бо сын ганьбуе бацьку, дачка паўстае супроць маці,
нявестка - супроць сьвякрові сваёй; ворагі чалавека -
хатнія ягоныя.
7 А я буду глядзець на Госпада, спадзявацца на Бога
выратаваньня майго: Бог мой пачуе мяне.
8 Ня радуйся дзеля мяне, непрыяцелька мая! хоць
я ўпаў, але ўстану; хоць я ў змроку, але Гасподзь
сьвятло мне.
9 Гнеў Гасподні я буду несьці, бо зграшыў перад Ім,
пакуль Ён ня вырашыць справы маёй і ня ўчыніць суд
над мною; тады Ён вывядзе мяне на сьвятло, і я ўбачу
праўду Ягоную.
10 І ўгледзіць гэта непрыяцелька мая, і сорам пакрые
яе, якая казала мне: «дзе Гасподзь Бог твой?»
Нагледзяцца на яе вочы мае, як яна будзе таптаная
быццам бруд на вуліцах.
11 У дзень збудаваньня сьценаў тваіх - у гэты дзень
аддаліцца вызначэньне.
12 У той дзень прыйдуць да цябе з Асірыі і гарадоў
Егіпецкіх, і ад Егіпта да ракі Еўфрата, і ад мора да
мора, і ад гары да гары.
13 А зямля тая будзе пустыняю за віну жыхароў яе, за
плады дзеяў іхніх.
14 Пасьві народ Твой жазлом Тваім, авечак спадчыны
Тваёй, якія жывуць самотна ў лесе сярод Карміла;
хай пасьвяцца яны на Васане і Галаадзе, як у дні

старадаўнія!
15 Як у дні зыходу твайго зь зямлі Егіпецкай, яўлю яму
дзівосныя дзеі.
16 Убачаць гэта народы і пасаромеюцца пры ўсёй
магутнасьці сваёй: пакладуць руку на вусны, вушы іх
зробяцца глухімі;
17 будуць лізаць пыл, як зьмяя, як чэрві зямныя
выпаўзуць яны з умацаваньняў сваіх; збаяцца Госпада
Бога нашага, і збаяцца Цябе.
18 Хто Бог, як Ты, Які выбачаеш беззаконьне і не
залічваеш злачынствы астатку спадчыны Тваёй? ня
вечна гневаецца Ён, бо любіць літаваць.
19 Ён зноў умілажаліцца з нас, загладзіць беззаконьні
нашыя. Ты ўкінеш у багну марскую ўсе грахі нашыя.
20 Ты явіш вернасьць Якаву, літасьць Абрагаму, якую
з клятваю абяцаў бацькам нашым ад дзён першых.

# Біблія (пераклад В.Сёмухі)
# The Holy Bible in Belarusan
## Белорусское Новый Завет и Притчи

copyright © 2016 John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Language: Belarusian

Translation by: Antoni Bokun

Contributor: John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

This translation is made available to you under the terms of the Creative Commons Attribution-No Derivatives license 4.0.
You may share, redistribute, or adapt this Bible translation or extracts from it in any format, provided that:

You include the above copyright and source information.

You do not use this work for commercial purposes.

Pictures included with Scriptures and other documents on this site are licensed just for use with those Scriptures and documents. For other uses, please contact the respective copyright owners.

2019-12-29

---

PDF generated using Haiola and XeLaTeX on 11 Nov 2022 from source files dated 29 Jan 2022
5bafea06-5eb3-574c-9054-5e4b38c21bbc